*Рыма Кавалёва*

# АБРАД «ВАДЖЭННЕ КУСТЫ» Ў АГРАГАРАДКУ ЛОБЧА ЛУНІНЕЦКАГА РАЁНА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

З палескага фальклору пачалася мая збіральніцкая праца, а з вывучэння куставых песен – навуковая. Кандыдацкая дысертацыя «Беларускія куставыя песні» (1976 год) стала на той час першай, спецыяльна прысвечанай аналізу гэтай унікальнай з’явы, якую я назірала ў жывым выкананні.

Час ішоў, і я, занятая іншымі справамі, не меркавала вяртацца да «Куста», калі б не распрацоўка навуковай тэмы «Лакальна-рэгіянальныя парадыгмы беларускага фальклору» і няўвага беларускіх фалькларыстаў да філалагічнага аналізу куставых песень. Так з’явіўся вучэбны дапаможнік для студэнтаў-філолагаў «Лакальна-рэгіянальныя парадыгмы беларускага фальклору. Заходнепалескія куставыя песні» (2008), дзе прапаноўваўся новы падыход да разгляду ўсяго кола твораў, давалася больш глыбокае прачытанне паэтычнага напаўнення абраду.

У фальклорным архіве вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ павінны захоўвацца матэрыялы нашай Лунінецкай экспедыцыі (1973 год) з запісамі куставых песень, зробленымі ў вёсках Лобча, Лунін, Багданаўка. Асабіста мяне цікавіла традыцыя ваджэння Куста ў Багданаўцы, адзначаная ў друкаваных крыніцах яшчэ ў ХІХ стагоддзі. Высветлілася, на гэты час яна працягвае жыць, прычым, што вельмі важна, у дзіцячым варыянце.

Куставая лакальна-рэгіянальная парадыгма беларускай каляндарнай абраднасці, у якую ўваходзіць абрад «Ваджэнне Кусты» у цяперашнім аграгарадку Лобча – унікальная з’ява, знак нацыянальнай адметнасці народнай культуры беларусаў у кантэксце славянскай традыцыі. Пры тыпалагічным падабенстве з абрадамі іншых славянскіх народаў, дзе галоўнай фігурай з’яўляецца апрануты ў зеляніну чалавек (жанчына або мужчына), абрад ваджэння Кусты (Куста) суправаджаецца песнямі, якім няма аналагаў. Гэта абходныя песні з адметнымі рэпрэзентатыўнымі, рытуальна-шлюбнымі, аграрна-магічнымі, патрабавальнымі матывамі, карагодна-таночныя, сэнсава звязаныя з рытуальнай ідэяй абраду, і бяседныя на заключным этапе. Усе гэтыя віды куставых песень прысутнічаюць у абрадзе з Лобчы.

Штогадовае бесперапыннае ўзнаўленне на Тройцу куставай традыцыі, перанятай ад старэйшага пакалення ўдзельніцамі фальклорна-этнаграфічнага гурта «Лабчанка» сумесна з вучаніцамі старэйшых класаў мае выключнае значэнне для далейшага існавання абраду. Тое, што выканаўцы захавалі і берагуць яго аўтэнтычную форму і змест ваджэння, маючы ў рэпертуары каля 30 песень, несумненная заслуга яшчэ жывых спявачак старэйшага пакалення і спеўных лідараў гурта, а таксама жыхароў Лобчы, якія чакаюць і шчыра прымаюць удзельнікаў святочных абходаў. Публічная і навуковая рэпрэзентацыя абраду, апекаванне з боку дзяржавы пасля прыняцця пад

ахову і надання яму статусу нематэрыяльнай культурнай спадчыны дазволіць беларусам усведамляць традыцыйную каляндарна-абрадавую культуру і носьбітаў яе скарбаў не проста як рэгіянальную адметнасць, а як безумоўную сусветную каштоўнасць. Можна прагназаваць, што пазначаныя акалічнасці ініцыіруюць адраджэнне куставой абраднасці ў тых мясцінах, дзе яна затухае і захоўваецца толькі ў памяці. Асабліва гэта важна для тэрыторыі Пінскага Палесся, якая з’яўлялася некалі эпіцэнтрам існавання традыцыі ваджэння Куста. Знаёмства беларусаў з жывым заходнепалескім абрадам будзе садзейнічаць іх духоўнаму развіццю, папоўніць веды пра ўнікальную культурную спадчыну народа.

Яшчэ адна падстава для ўключэння абраду ваджэння Кусты ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь – лабчанскі варыянт назвы. «Ваджэнне Кусты» (жаночы род, у назоўным склоне – Ку́ста) на фоне больш вядомай назвы «Ваджэння Ку́ста» (мужчынскі род, у назоўным склоне – Куст) з’яўляецца рэліктам, праз які толькі і можна адэкватна інтэрпрэтаваць функцыянальна-семантычны комплекс абраду, звязанага, на нашу думку, з сінкрэтычным культам Роду. Зnative мужчынскага/жаночага ў семантыцы Роду дала пры расчапленні пару – Куст і Ку́ста. Аксіялагічная перавага бацькоўскага роду (Куста) у далейшым, у земляробчую эпоху, змяніла акцэнты у абрадавай тэрміналогіі, але, як бачым, не ўсюды. Дадатковым аргументам на карысць дзяржаўнай увагі менавіта да лабчанскай версіі абраду з’яўляецца яго выхаваўчы патэнцыял. Куст і Ку́ста разам – нацыянальны беларускі брэнд, здольны выканаць станоўчую ролю ў справе прапаганды каштоўнасці сям’і, якая «звівае» ніці бацькоўскага роду з мацярынскім, «Ку́ста» з « Ку́стай». Заўважым таксама, што наяўнасць куставага абраду гуманізуе і кансалідуе соцыум, спрыяе развіццю патрыятычных пачуццяў, развівае эстэтычны густ. Ён здольны стаць важкім складнікам ідэйна-выхаваўчай работы ў школе, процістаяць разбуральным тэндэнцыям, пад уплыў якіх, на жаль, трапляюць цяперашнія падлеткі і моладзь.

Абрад «Ваджэнне Кусты» – эстэтычна значная з’ява. Ён прыгожы з візуальнага боку, багаты на мастацкае напаўненне, традыцыйны па структуры, але дае прастор для дыялогавай імправізацыі. З’яўленне аграгарадкоў у Беларусі ставіць перад дзяржавай задачу спрыяць развіццю і ўмацаванню ўласных культурных традыцый такіх паселішчаў. Без спрадвечных народных традыцый аграгарадкі будуць для іх жыхароў не родным кутам, а месцам пражывання ці месцам працы. Я б рэкамендавала зрабіць панядзелак у Лобчы святочным днем, які можна адпрацаваць у выхадны. Такія пераносы практыкуюцца на дзяржаўным узроўні. Але чаму б іх не практыкаваць ў асяродках, дзе бытуюць элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны? У школе таксама перанесці хоць бы частку ўрокаў на іншы дзень. Гэта дасць магчымасць усім жыхарам Лобчы далучыцца да традыцыі, ганарыцца ёю, садзейнічаць пераемнасці. Дарэчы, лабчанская школа магла б мець сваю праграму этнавыхавання на аснове мясцовых традыцый, тым больш, што яна мае музычны ўхіл. Далучаць дзяцей да

абрадаў гадавога кола, да пераемнасці народных рамёстваў з вырабам строяў для сябе, абрадавай атрыбутыкі, да ведаў па народнай кулінарыі і інш., значыць з малых гадоў уключаць іх у нацыянальны культурны працэс. Як вядома, звычайна ў вялікіх палескіх сёлах было некалькі гуртоў з «Кустам», і кожны абслугоўвае сваю тэрыторыю (або свой «канец», як кажуць, бо сёлы былі раздзелены на пасёлкі або «канцы», якія мелі свае назвы). З часам і ў Лобчы моладзь, дзеці і падлеткі могуць дзяліцца на такія гурты.

Станоўчы прыклад Лобчы ў захаванні абраду ваджэння кусты ў жывой традыцыі паслужыць стымулам для іншых паселішчаў Лунінецкага раёна і суседніх з ім, дзе гэты абрад існаваў. Гурт «Ларчанка» далучае да свайго абраду і новых, некарэнных, жыхароў аграгарадка, што добра для культурнай кансалідацыі супольнасці. Эстэтычныя патрэбы агратурызму або этнатурэзму таксама могуць стаць стымулам для папулярызацыі абраду ваджэння Кусты, асэнсавання яго значнасці для прэзентацыі этнічнай культуры беларусаў унутры краіны і за яе межамі. Але перш за ўсё ён важны для саміх жыхароў Лобчы, нездарма яны беражліва захавалі яго для нашага часу. Лічу, што гэты абрад варты ўключэння ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь з наданнем яму статусу элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны.